# ЛЯЎКІ: ПОЗІРК У МІНУЛАЕ

Сёлета адзначаецца 135 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, драматурга, публіцыста, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальнай акадэміі навук Украіны Янкі Купалы.



З гэтай нагоды мы, студэнты філалагічнага факультэта спецыяльнасці «Беларуская філалогія», на чале з дацэнтам кафедры беларускага мовазнаўства Галінай Канстанцінаўнай Семяньковай і дацэнтам кафедры літаратуры Віталем Феліксавічам Падстаўленкам накіраваліся на экскурсію ў вёску Ляўкі, каб яшчэ больш даведацца пра жыццё і творчасць класіка беларускай літаратуры. Менавіта тут, у вёсцы Ляўкі, з 1935 па 1941 год Янка Купала стварыў свой вядомы цыкл лірычных вершаў.



Вёска знаходзіцца ў Аршанскім раёне Віцебскай вобласці. Усяго паўтары гадзіны ў дарозе – і вось яно, тое месца, якое ўражвае сваёй непаўторнай прыгажосцю. На жывапісным беразе Дняпра размешчаны музейны комплекс «Ляўкі» – філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. На тэрыторыі комплексу, агульная плошча якой складае 19 гектараў, знаходзяцца будынак былой канторы Копыскага лясніцтва, гаспадарчыя пабудовы, домік шафёра, гараж, у якім стаіць «шэўрале» пісьменніка – аўтамабіль, падараваны ўрадам БССР у 1939 годзе, памятны камень, прывезены з Мінска пасля ўсталявання новага помніка. А галоўным аб'ектам экспазіцыі з'яўляецца рэканструяванае лецішча Янкі Купалы. У Вялікую Айчынную вайну яно было спалена, а пасля адбудавана нанова. Менавіта на лецішчы пісьменнік адпачываў са сваімі сябрамі і блізкімі. У госці да творцы кожны дзень прыходзілі вяскоўцы, да якіх паэт адносіўся з асаблівай шчырасцю і павагай.

«На гэтым месцы, дзе сёння ўсталяваны помнік Янку Купалу, мы збіраліся цёплымі летнімі вечарамі», – успамінаюць вяскоўцы. З асаблівым хваляваннем крочаць яны па знаёмых сцяжынках, каля векавых дубоў, пад якімі, магчыма, калісьці прагульваўся пісьменнік і абдумваў свае геніяльныя творы.

**Ганна ЧАРНЯЎСКАЯ,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**